Азёма К.У., студ. гр. 414 ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

**“НОВЫЯ” СВЯТЫ У ТРАДЫЦЫЯХ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА: ГЕНЭЗІС І АБРАДАВЫЯ КАМПАНЕНТЫ**

У культурнай прасторы сучаснай Беларусі ўсталяваліся святы, звязаныя з дзяржаўнай ідэалогіяй: Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці; святы, якія паходзяць сваімі каранямі з традыцыйнай народнай культуры і хрысціянства: Купалле, Каляды, Дажынкі. Фалькларысты назіраюць з’яўленне новых, свецкіх па свайму паходжанню свят, асэнсаванне якіх уяўляе цікавасць для вывучэння сучаснасці. Да іх адносяцца, у першую чаргу, – Хэлоўін і Дзень святога Валянціна. Маштаб іх святкавання не з'яўляецца меншым у параўнанні з афіцыйнымі святамі. Людзі адзначаюць іх з такім жа натхненнем і захапленнем. Вялікая частка такіх свят з’явілася нядаўна, але яны таксама маюць сваю гісторыю, традыцыі і звычаі.

Генэзіс Хэлоўіна звязаны з гісторыяй кельцкіх плямёнаў, якія ў дахрысціянскую эпоху засялялі землі сучаснай Англіі, Ірландыі і паўночнай Францыі. Яны былі язычнікамі і як вярхоўнага бога шанавалі бога Сонца. Па паданні, на працягу кожнай зімы ён знаходзіўся ў палоне ў Самхэйна – уладара мёртвых і князя цемры. У дзень, які адпавядае нашаму 31 кастрычніка, старажытныя кельты адзначалі сваё галоўнае свята – Самхэйн (Samhain). Гэтаму святу яны надавалі вельмі вялікае значэнне: ён азначаў канчатак збору ўраджая і сімвалізаваў канец старога і пачатак новага года. Кельты верылі ў зараджэнне жыцця са смерці. Легенда кажа, што ў гэту ноч Самхэйн адчыняе браму ў мінулае і будучыню. Ведзьмы і дэманы – героі Хэллоуіна – гэта цені захавальнікаў варот. «Дзеля таго, каб не патрапіць мёртваму ў рукі людзі прыбіраліся як мага страшней. З дапамогай гэтага яны хацелі напужаць прывідаў і іншую нячыстую сілу.» [1,ст.55] Для духаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вуліцу выносілі разнастайныя пачастункі. У Самхэйн уладкоўваліся разнастайныя варожбы і ахвярапрынашэнні.

Сучасная назва – «Хэлоўін» – свята атрымала ў IX ст., калі Татам Рыгорам III было перанесена святкаванне Дня ўсіх святых з 13 траўня на 1 лістапада. «Дзень напярэдадні – 31 кастрычніка – у сярэднявечнай ангельскай мове атрымаў назву All Hallows Even, ці All Hallows Eve (што азначае «вечар усіх святых»). Пазней яго сталі зваць – Halloween»[2].Супадзенне дат прывяло да таго, што паганскае свята не толькі выжыла, але і непарыўна зраслося ў народнай свядомасці са святам царкоўным, з-за чаго Хэлоўін набыў афарбоўку Самхэйна.

Сучасны выгляд свята набыло толькі ў XIX ст. дзякуючы еўрапейскім эмігрантам, якія прывезлі з сабой у ЗША звычай выконваць усе забабоны, злучаныя з Хэлоўінам. Першымі вялікімі гарадамі, дзе ў 20-х гадах XX ст. адбылася святкаванне Хэлоўіна, сталі Нью-Ёрк і Лос-Анджэлес. Святочныя касцюмы, свечкі, упрыгожванні, віншавальныя паштоўкі і гарбузы карыстаюцца велізарнай папулярнасцю, нягледзячы на тое, што свята дагэтуль не з'яўляецца афіцыйным.

На сённяшні дзень мы можам адзначыць наступныя абрадавыя кампаненты ў святкаванні Хэлоўіна на тэрыторыі Беларусі: па-першае, гэта перапрананне і масавыя гулянні моладзі па горадзе; па-другое, святочны бодыарт; па-трэцяе, ў клубах уладкоўваюцца тэматычныя вечары, а тыя, хто святкуюць у хатніх умовах – робяць пудзіла з гарбуза, запальваюць у іх свечкі і праводзяць розныя конкурсы. Такім чынам, галоўным знакам Хэлоўіна з'яўляецца гарбуз, галоўным рэквізітам – касцюм. Свята мае досыць багатую гісторыю і традыцыі, і абвеяна рознымі легендамі. Усе гэтыя аспекты паказваюць на тое, што свята мае права на існаванне і далейшае ўкараненне не толькі ў Амерыцы і Еўропе, але і ў нашай рэспубліцы.

Яшчэ адным новым святам у сучасным грамадстве Беларусі з'яўляецца Дзень усіх закаханых ці Дзень святога Валянціна. Яго генэзіс злучаны з дзеямі хрысціянскага святара Валянціна, які жыў у часы кіравання рымскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

імператара Юлія Клаўдзія II [3]. У тыя гады рымскае войска ўвесь час ваявала і мела патрэбу ў адважных салдатах. Таму імператар забараніў легіянерам браць шлюб. Але епіскап горада Церніі Валянцін, насуперак імператарскай забароне, таемна вянчаў закаханых салдатаў. Праз некаторы час Валянцін быў схоплены і прысуджаны да пакарання. Седзячы ў турме, ён закахаўся ў дзяўчыну. Але, нажаль, каханне Валянціна не выратавала, і ён быў пакараны 14 лютага прыблізна ў 270 годзе нашай эры. Перад смерцю Валянцін напісаў ліст сваёй пакаханай, якое скончыў словамі «Ад Твайго Валянціна». Як сведчыць легенда, гэты ліст і паклаў пачатак традыцыі пісаць сваім каханым лісты з прызнаннямі ў каханні – валянцінкі, а выраз From your Valentine стала фігуральным і ў замежных паштоўках выкарыстоўваецца дагэтуль. Пасля, як хрысціянскі пакутнік, пацярпелы за веру, Валянцін быў кананізаваны каталіцкай царквой. А ў 496 годзе Тата рымскі Геласіус абвясціў 14 лютага Днём святога Валянціна. «З тых часоў закаханыя шануюць Святога Валянціна і лічаць яго сваім заступнікам. Мошчы Святога Валянціна, захаваліся да нашых дзён. Яны захоўваюцца ў Шатландскім горадзе Глазга ў Рымска-каталіцкай царкве благаславёнага Джона Данса» [5,ст.292]. Некаторыя гісторыкі лічаць, што святам святога Валянціна Хрысціянская царква вырашыла замяніць паганскае свята Lupercalia – фэст эратызму і ўрадлівасці, які святкаваўся ў Старажытным Рыме 15 Лютага. Адной з традыцый святкавання Lupercalia была своеасаблівая «любоўная латарэя». «Усе маладыя жанчыны пісалі свае імёны на кавалках пергамента і кідалі іх у вялікую пасудзіну. Кожны з гарадскіх халасцякоў павінен быў абраць кавалак пергамента з імем і такім чынам станавіўся парай для гэтай жанчыны на цэлы год. Такія з'явы часта сканчаліся шлюбам» [3].

Такім чынам, у кантэксце аналізу абрадавых кампанентаў свята можна вылучыць наступныя: дарэнне падарункаў і кветак, запальванне свечак, святочная пошта, перадача валянцінак, святочнае афармленне памяшкання, правядзенне розных спаборніцтваў, а таксама правядзенне розных варожбаў. Варта адзначыць, што французы першымі ўвялі «валянцінкі» як любоўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасланні-чатырохрадкоўі. «Дзень святога Валянціна сімвалізуюць галубкі, сэрцы, працятыя стралой Амура, а таксама чырвоны і белы колер: чырвоны азначае моцнае пачуццё, белы – чысціню кахання» [5,ст.293]. Галоўным рэквізітам Дня ўсіх закаханых з'яўляецца валянцінка. Свята мае шмат традыцый, варожбаў, рытуалаў, выпрацаваных на працягу шматлікіх стагоддзяў. У Европе 14 лютага адзначаецца з 13 стагоддзя, у США – з 1777 года. У Беларусь, як і ў іншыя краіны СНД, гэта свята прыйшло напачатку 90-х і хутка стала сапраўды ўсенародным і любімым святам.

Такім чынам, святы Хэлоўін і Дзень усіх закаханых прыйшлі да нас з-за мяжы і добра замацаваліся ў грамадскім жыцці. З кожным годам у святкаванні ўдзельнічае ўсё большая колькасць чалавек, і з кожным годам традыцыі гэтых свят усё больш укараняюцца ў культуры і карэктуюцца грамадствам нашай краіны. Гэтыя дні не занесены ў календары знамянальных дат і ўсенародных свят, але іх цалкам можна аднесці да міжнародных, паколькі яны адзначаюцца і ў Расіі, і ў шматлікіх краінах Еўропы, а таксама часткова ў Амерыцы і нават на Усходзе. Такім чынам, маючы ўсеагульнае прызнанне, магчыма ў хуткім часе «новыя» святы нашага грамадства набудуць статус афіцыйных і з'явяцца ў календарах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Самые интересные сценарии [автор-сост. О.В. Сологубова – Москва 2008 г.]
2. Интэрнэт-крыніца: http://www.pozdrav.ru/history/history-31-october.shtml
3. Интэрнэт-крыніца: http://blogs.mail.ru/mail/bsv_80g/4D5B4F4DC82BE56A.html
4. Праздник в каждый дом: книга для всей семьи [автор-сост. О.Э.Колосовская] – Мн.: Юнипресс, 2005 г.
5. Энциклопедия зимних праздников; СПб.: Респекс, 1995 г.